*ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ*

# ТЭОРЫЯ ІНФАРМАЦЫІ І КАМУНІКАЦЫІ

*ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ*
1-23 01 11 – Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

Курс 1

Семестр I-II

Лекцыі 44

Практычныя (семінарскія) заняткі 12

Экзамен II

Аўдыторных гадзін па вучэбнай дысцыпліне 56

Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне 164

Форма атрымання вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

Склала Надзея Юр'еўна Вайцэховіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове тыпавой вучэбнай праграмы Тэорыя інфармацыі і камунікацыі (2010)

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (пратакол № 2 ад 23.09.2015 г.)

Загадчык кафедры

__________В.А. Касап

Минск
2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ЗМЕНЫ ДА ПРАГРАМЫ (РАБОЧАЯ ПРАГРАМА)

## УСТУП

Вучэбная дысцыпліна “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” ўваходзіць у абавязковы кампанент вучэбнага плана для студэнтаў па спецыяльнасці 1-23 01 11 бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць. Праграма дысцыпліны складзена з улікам інструкцыі “Порядок разработки и утверждения учебных программ и программ практики для реализации содержания образовательных программ высшего образования I ступени” (от 27.05.2013 № 405).

*Мэта дысцыпліны* – засваенне студэнтамі тэарэтычных асноў інфармацыі і камунікацыі, якое забяспечыць фарміраванне прафесійнага мыслення на аснове вывучэння сутнасці інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з’яў, асэнсавання іх фундаментальнай ролі і спецыфікі праяўлення ў інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці, а таксама засваення спосабаў першаснага аналізу, абагульнення і мадэлявання розных тыпаў сацыяльных камунікацый.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне наступных *задач*:

– раскрыць катэгарыяльны апарат тэорыі інфармацыі і камунікацыі, сфарміраваць міждысцыплінарны падыход да вывучэння інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з’яў;

– навучыць вызначэнню і аналізу механізмаў функцыяніравання інфармацыі ў прыродзе і грамадстве, яе ўласцівасцей, відаў, спосабаў вымярэння і ацэнкі якасці, асаблівасцей яе фарміравання і выкарыстання ў інфармацыйна-дакументнай сферы;

– забяспечыць разуменне эвалюцыі сацыяльных камунікацый пад уплывам біялагічных, тэхнічных, культуралагічных фактараў, вывучэнне розных тыпаў, відаў і форм камунікатыўнай дзейнасці, мадэляў і каналаў камунікацыі, аперыраванне атрыманымі ведамі пры аналізе і прагназаванні камунікатыўных працэсаў у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– законы і заканамернасці інфармацыі і камунікацыі, механізмы ўзнікнення і функцыянавання інфармацыі ў прыродзе і грамадстве;

– уласцівасці і функцыі інфармацыі, віды і формы прадстаўлення інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах;

– сутнасць і разнавіднасці інфармацыйных і камунікатыўных працэсаў у грамадстве;

– асноўныя кампаненты і функцыі сацыяльнай камунікацыі, формы і віды камунікацыйнай дзейнасці.

*умець:*

– праводзіць сістэмны і параўнальны аналіз разнастайных канцэпцый разумення інфармацыі і камунікацыі;

– выкарыстоўваць міждысцыплінарныя падыходы да вывучэння інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў;

– вызначаць характэрныя рысы камунікацый у сістэме класічнага, некласічнага і постнекласічнага тыпу рацыянальнасці, спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці у сістэме сучасных сацыяльных камунікацый.

*валодаць:*

– рэсурсным падыходам да інфармацыі;

– падыходамі да вызначэння эфектыўнасці сацыяльных (у тым ліку бібліятэчных) камунікацый, вызначэння праблем і шляхоў іх пераадолення;

– спосабамі арганізацыі прафесійнай камунікацыі на аснове ведаў аб відах, мадэлях, каналах сацыяльнай камунікацыі.

Вучэбная дысцыпліна скіравана на вывучэнне міждысцыплінарных феноменаў інфармацыі і камунікацыі, што магчыма толькі пры фарміраванні цэласнага ўяўлення аб фізічных, біялагічных, сацыяльных, культуралагічных асновах інфармацыйных і камунікатыўных працэсаў і з’яў. Гэта абумоўлівае павышаную складанасць дысцыпліны і патрабуе трывалых сувязей з дысцыплінамі агульнапрафесійнага цыклу: “Дакументалогія”, “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя”, “Інфармацыйная культура асобы”. “Тэорыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі і камунікацыі” забяспечвае міждысцыплінарную інтэграцыю агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў і фарміраванне на гэтай аснове цэласнага інфармацыйнага светапогляду.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння дысцыпліны “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” рэкамендуецца выкарыстоўваць педагагічныя тэхналогіі для актывізацыі дзейнасці студэнтаў (праблемнае навучанне, гульнёвыя тэхналогіі), для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу (індывідуалізацыя навучання, тэхналогія паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў), тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці, калектыўныя і групавыя спосабы навучання і інш.

Вывучэнне дысцыпліны разлічана на 126 гадзін, з іх 56 – аўдыторныя. У межах вывучэння курса прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі (уводныя, бягучыя, аглядныя, абагульняльныя), семінары (абмеркаванне дакладаў, семінар-дыскусія, семінар-даследаванне). Прыкладнае размеркаванне аўдыторных заняткаў: 44 – лекцыйных, 12 – семінарскіх. На самастойную кіруемую работу студэнтаў адведзена 70 гадзін. Выніковай формай кантролю ведаў з'яўляецца экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАБОЧАЯ ПРАГРАМА

## УСТУП

Вучэбная дысцыпліна “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” з’яўляецца агульнапрафесійнай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. У адпаведнасці з вучэбным планам яе павінны засвоіць студэнты ўсіх спецыялізацый факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (I курс) і факультэта завочнага навучання (I курс адпаведных спецыялізацый).

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны абумоўлена фундаментальнай роляй інфармацыі і камунікацыі ў фарміраванні прафесійнага светапогляду студэнтаў, здольнасцей аналізаваць і абагульняць розныя з’явы ў сістэме інфармацыйна-камунікатыўных ведаў, прагназаваць інфармацыйна-камунікатыўныя працэсы і спецыфіку праяўлення іх у бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Мэтай дысцыпліны “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” з’яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтычных асноў інфармацыі і камунікацыі, якое забяспечыць міждысцыплінарную інтэграцыю агульнапрафесіных і спецыяльных ведаў на аснове вывучэння фундаментальных з’яў прафесійнай дзейнасці, дазволіць студэнтам набыць першасныя навыкі самастойнага аналізу інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў у грамадстве.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае комплекс задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў, уменняў і навыкаў:

– забяспечыць вывучэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў інфармацыі і камунікацыі ў сацыягуманітарным кантэксце;

– навучыць аналізу, сінтэзу, параўнанню, прагназаванню інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з’яў у грамадстве;

– паказаць спецыфіку інфармацыйных працэсаў у сацыядакументальнай сферы і навучыць студэнтаў прымяняць атрыманыя веды для вывучэння бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і з’яў.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” студэнт *павінен разумець і ведаць:*

- логіку развіцця і сутнасць асноўных канцэпцый разумення паняццяў “інфармацыя” і “камунікацыя”;
- механізмы ўзнікнення і функцыянавання інфармацыі ў нежывой, жывой прыродзе і грамадстве;
- меры інфармацыі сінтаксічнага, семантычнага і прагматычнага ўзроўняў, атрыбутыўныя і прагматычныя ўласцівасці інфармацыі, знешнія і ўнутраныя функцыі інфармацыі;
- віды і формы прадстаўлення інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах;
- механізмы арэчаўлення інфармацыі і асаблівасці дакументнай формы арэчаўлення;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- рэсурсны падыход да інфармацыі, азначэнне, спецыфіку, уласцівасці, функцыі і відавую класіфікацыю інфармацыйных рэсурсаў;
- сутнасць і разнавіднасці інфармацыйных і камунікатыўных працэсаў у грамадстве;
- асноўныя кампаненты сацыяльнай камунікацыі і яе элементарную схему;
- камунікатыўныя патрэбы як зыходную прычыну камунікатыўнай дзейнасці
- функцыі камунікацыі, формы і віды камунікатыўнай дзейнасці;
- віды памяці і мнемічныя дзеянні, структуру сацыяльнай памяці грамадства;
- натуральныя і штучныя камунікатыўныя каналы;
- асаблівасці і спецыфіку камунікацыі ў розных сацыяльных сферах;
- спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці як каналу сацыяльнай камунікацыі, асноўны прадмет бібліятэчна-бібліяграфічных камунікацый, тыпы і віды камунікацыі ў бібліятэчнай сферы;
- законы і заканамернасці інфармацыі і камунікацыі.

У выніку засваення гэтых ведаў студэнт павінен валодаць *наступнымі спосабамі мысленчай і практычнай дзейнасці:*

- праводзіць сістэмны і параўнальны аналіз разнастайных канцэпцый разумення інфармацыі і камунікацыі;
- абгрунтоўваць правамернасць рэалізацыі ў інфармацыйна-камунікацыйнай тэорыі і практыцы розных канцэпцый ў залежнасці ад мэты даследчай і практычнай дзейнасці;
- аналізаваць і праводзіць размежаванне па аб’ёме і змесце паняццяў ―інфармацыя” і ―камунікацыя” з сумежнымі паняццямі;
- выкарыстоўваць міждысцыплінарныя падыходы да вывучэння інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў;
- тлумачыць сутнасць асноўных катэгорый тэорыі інфармацыі і камунікацыі, выкарыстоўваць лагічныя і гістарычныя, сутнасныя і фенаменалагічныя, змястоўныя і фармальныя падыходы да вывучэння інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і з’яў;
- прадстаўляць інфармацыйныя працэсы і працэсы камунікацыі на мове тэорыі інфармацыі і камунікацыі;
- вызначаць характэрныя рысы камунікацый у сістэме класічнага, некласічнага і постнекласічнага тыпу рацыянальнасці, месца і ролю ўласнай прафесійнай дзейнасці у сістэме сучасных сацыяльных камунікацый;
- выстройваць прафесійную камунікацыю на аснове ведаў аб відах, жанрах і стылях сацыяльнай камунікацыі;
- вызначаць камунікатыўныя патрэбы і спосабы іх задавальнення, умець ацаніць эфектыўнасць бібліятэчна-бібліяграфічных зносін, вызначыць праблемы і шляхі іх пераадолення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паспяховае засваенне студэнтамі курса ―Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” магчыма на аснове трывалых ведаў, атрыманых пры вывучэнні іншых агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння дысцыпліны ―Тэорыя інфармацыі і камунікацыі” рэкамендуецца выкарыстоўваць педагагічныя тэхналогіі для актывізацыі дзейнасці студэнтаў (праблемнае навучанне, гульнёвыя тэхналогіі), для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу (індывідуалізацыя навучання, тэхналогія паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў), тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці, калектыўныя і групавыя спосабы навучання і інш.

У межах вывучэння курса прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі, семінары, самастойная работа; разнастайныя формы бягучага кантролю за паспяховасцю студэнтаў. Вучэбная дысцыпліна разлічана на 126 гадзін, у тым ліку 48 гадзін аўдыторных заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### *Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы курса “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі”, яго месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння курса. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, формы кантролю. Вучэбна-метадычная забяспечанасць курса.

## РАЗДЗЕЛ І. ТЭОРЫЯ ІНФАРМАЦЫІ

### *Тэма 1. Інфармацыя як навуковая катэгорыя*

Узнікненне паняцця “інфармацыя” і яго развіццё на дакібернетычным, кібернетычным і посткібернетычным этапе. Сучасныя падыходы да вызначэння зместу і сутнасці феномена інфармацыі. Фарміраванне і развіццё атрыбутыўнай, функцыяналістычнай і камунікатыўнай канцэпцый разумення інфармацыі.

Інфармацыя як міждысцыплінарная катэгорыя. Паняцце інфармацыі ў навуках аб інфармацыі. Матэматычнае, кібернетычнае, прыродазнаўчае, філасофскае, сацыялагічнае вызначэнне паняцця інфармацыі. Інфармацыя ў межах фізічных і біялагічных узаемадзеянняў. Інфармацыя як фактар развіцця чалавека і грамадства. Элементарная, біялагічная, тэхніка-кібернетычная і сацыяльная інфармацыя.

Узаемасувязь і спецыфіка тэрмінаў “звесткі”, “дадзеныя”, “інфармацыя”, “веды”.

### *Тэма 2. Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі*

Аспекты вывучэння феномена інфармацыі. Закон незнішчэння інфармацыі і яго сутнасць. Закон паскарэння і павелічэння аб’ёму інфармацыі. Атрыбутыўныя ўласцівасці інфармацыі: здольнасць памнажаць разнастайнасць матэрыяльнага свету, дыскрэтнасць, рассейванне і канцэнтрацыя інфармацыі, запамінальнасць, перадавальнасць, пераўтваральнасць і інш. Прагматычныя ўласцівасці інфармацыі: каштоўнасць, карыснасць, паўната, навізна, дакладнасць, аб’ектыўнасць, даставернасць, своечасовасць, даступнасць і інш.

Класіфікацыя мер інфармацыі. Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях.

Якасці інфармацыі (змястоўнасць і абароненасць). Змястоўнасць: значнасць – паўната, ідэнтычнасць, кумулятыўнасць – выбіральнасць, гомамарфізм, абароненасць: захаванасць, дакладнасць, канфідэнцыяльнасць.

Класіфікацыя інфармацыі ў аўтаматызаваных сістэмах па адносінах да аб’екта, сувязі з мэтай, па якасці праявы, паўнаце адлюстравання і інш. прыметах.

*Семінар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення*

Паняцце сацыяльнай інфармацыі, яе сутнасць і асноўныя ўласцівасці. Знешнія і унутраныя функцыі сацыяльнай інфармацыі. Механізм арэчаўлення сацыяльнай інфармацыі. Матэрыяльная прырода зместу інфармацыі. Сродкі стварэння зместу. Тыпы моў па прасторавай падачы інфармацыі. Інструмент увасаблення зместу. Знак, мова, код. Матэрыяльная аснова інфармацыі. Фізічная форма. Носьбіты сацыяльнай інфармацыі. Дакументальная інфармацыя і яе носьбіты. Акустычная (маўленчая) інфармацыя і яе носьбіты. Тэлекамунікацыйная інфармацыя і яе носьбіты.

Дакументаванне як асноўны спосаб фіксавання сацыяльнай інфармацыі. Спецыфіка і асноўныя ўласцівасці дакумента як формы арэчаўлення інфармацыі.

*Семінар.*

### *Тэма 4. Інфармацыйныя працэсы*

Інфармацыйная дзейнасць і інфармацыя. Кадзіраванне, збор, захоўванне, перадача, апрацоўка, абарона інфармацыі. Асаблівасці інфармацыйных працэсаў у дакументальнай сферы. Стварэнне дакументаў. Выданне дакументаў. Распаўсюджанне дакументаў. Захоўванне дакументаў. Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў. Доступ да дакументаў.

Інфармацыйныя патрэбы і паводзіны. Бібліятэка як інфармацыйна-пошукавая сістэма.

### *Тэма 5. Інфармацыя як стратэгічны рэсурс грамадства*

Інфармацыйнае грамадства, яго прыметы, перадумовы і механізмы станаўлення. Паняцце інфармацыйных рэсурсаў, электронных інфармацыйных рэсурсаў, бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў, інфармацыйнай прадукцыі, бібліяграфічнай прадукцыі, інфармацыйнага асяроддзя, інфармацыйнага патэнцыялу грамадства.

Інфармацыйны рэсурс як форма прадстаўлення ведаў. Спецыфіка інфармацыйных рэсурсаў у параўнанні з матэрыяльнымі і энергетычнымі рэсурсамі. Уласцівасці, функцыі і прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Відавая класіфікацыя інфармацыйных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РАЗДЗЕЛ ІІ. ТЭОРЫЯ КАМУНІКАЦЫІ

### *Тэма 6. Генезіс і развіццё паняцця “камунікацыя”*

Праблема камунікацыі ў антычнай і сярэдневяковай навуцы, нямецкай філасофіі, герменэўтыцы і семіётыцы. Распрацоўка тэорыі камунікатыцыі ў межах найбольш значных філасофскіх накірункаў ХХ ст.: біхевіярызм, экзістэнцыялізм, персаналізм, аналітычная і лінгвістычная філасофія, сімвалічны інтэракцыянізм.

Сучасныя канцэпцыі камунікацыі. Сутнасць трансляцыйнай і інтэракцыянальнай парадыгмы. Трансляцыйныя падыходы да вывучэння камунікацыі: тэхналагічнага дэтэрмінізма (на прыкладзе тэорыі інфармацыйнага грамадства), культуралагічная тэорыя камунікацыі Г.М. Маклюэна, матэматычная тэорыя камунікацыі. Інтэракцыянальныя падыходы да вывучэння камунікацыі: канцэпцыя этнаметадалогіі, фрэймавая канцэпцыя І. Гофмана, тэорыя міжкультурнага зместу камунікацыі Э. Хола, тэорыі сацыяльнага абмену, структурная лінгвістыка, сучасная семіётыка, тэорыі масавай камунікацыі.

Міждысцыплінарныя сувязі тэорыі камунікацыі.

*Семінар.*

### *Тэма 7. Канцэпцыі сацыяльных камунікацый*

Сучасныя канцэпцыі разумення сутнасці сацыяльнай камунікацыі: рытарычная, семіятычная, кібернетычная, сацыяльна-псіхалагічная, дыялагічная, герменеўтычная, постмадэрністычная і інш. Паняцце камунікацыі і камунікатыўных працэсаў у межах класічнага, некласічнага, постнекласічнага тыпу рацыянальнасці. Тэорыя дыялога. Сэнс, разуменне і інтэрпрэтацыя. Азначванне і мысленная камунікацыя. Тэорыя дыскурса і гульнёвых вербальных практык.

Суадносіны паняццяў ―камунікацыя”, ―сацыяльная камунікацыя”, ―зносіны”.

### *Тэма 8. Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі*

Законы і заканамернасці сацыяльнай камунікацыі. Іерархія чалавечых запатрабаванняў як зыходная прычына камунікатыўнай дзейнасці. Канцэпцыі патрэбнасці людзей амерыканскіх даследчыкаў Р.Дымблбі і Г.Бэртана, А.Маслоў, рускага навукоўца А.У.Сакалова.

Асноўныя кампаненты сацыяльнай камунікацыі. Элементарная схема камунікацыі.

Асноўныя мэты, якія ставяць перад сабой суб’екты камунікацыі.

Функцыі камунікацыі. Функцыянальная мадэль Карла Бюлера, якая адносіцца да функцыі мовы і паведамлення. Функцыянальная мадэль Рамана Якабсана.

*Семінар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Камунікатыўная дзейнасць*

Паходжанне камунікатыўнай дзейнасці. Лінейныя і нелінейныя мадэлі камунікацыі. Асноўныя элементы камунікатыўнага працэса. Камунікатыўныя бар’еры. Віды, узроўні і формы камунікатыўнай дзейнасці. Мікракамунікацыя, мідзікамунікацыя, макракамунікацыя. Вербальная камунікацыя і яе формы. Невербальная камунікацыя і яе формы. Міжасабовая, групавая і масавая камунікацыя.

Сацыяльныя сферы камунікацыі: бытавая, вытворчая, бізнес-камунікацыя, навуковая, адукацыйна-педагагічная, шоу-бізнесу і спартыўнага бізнесу, турыстычнага бізнесу, медыцынская і юрыдычная, міжнародная камунікацыя. Стылі і жанры прафесійна-арыентаванай камунікацыі.

Паняцце аб эфектыўнасці камунікацыі.

Дзейнасць сацыяльна-камунікатыўных інстытутаў.

### *Тэма 10. Сацыяльная памяць*

Віды памяці і мнемічныя дзеянні. Генетычная памяць або спадчыннасць, псіхічная памяць і яе віды. Мнемічныя дзеянні. Інфармацыйная мадэль індывідуальнай памяці. Групавая сацыяльная памяць і яе раздзелы. Структура сацыяльнай памяці грамадства.

### *Тэма 11. Камунікатыўныя каналы*

Вызначэнне паняцця –канал сацыяльнай камунікацыі”. Разнавіднасці камунікацыйных каналаў. Натуральныя камунікацыйныя (невербальны і вербальны) каналы. Узнікненне штучных камунікацыйных каналаў. Канал іканічных і знакавых дакументаў. Мастацкія камунікацыйныя каналы. Тэхнічныя камунікацыйныя каналы. Тры віды сацыяльнай камунікацыі: вусная, дакументная, тэлекамуникатыўная.

### *Тэма 12. Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі*

Бібліятэчныя і бібліяграфічныя зносіны як разнавіднасць інфармацыйных сувязей. Асноўны прадмет бібліятэчна-бібліяграфічных зносін. Міжасобасная, групавая і масавая камунікацыя ў органах інфармацыі і бібліятэках. Бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як арганізаваны ўзровень бібліятэчна-бібліяграфічнай камунікацыі. Параўнанне з іншымі аб’ектамі сацыяльна-камунікацыйнай дзейнасці (клубна-забаўляльнай, сістэма масавай камунікацыі, радыё, тэлебачанне, часопісна-выдавецкая дзейнасць і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| | Назва раздзела тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кіруемая СРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінар. заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Уводзіны | 1 | | | |
| | **Раздзел I. Тэорыя інфармацыі** | | | | |
| 2 | Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 5 | 2 | 6 | тэст, абмеркаванні |
| 3 | Асновы функцыяніравання інфармацыі ў грамадстве | 6 | 2 | 4 | тэст, даследчыя заданні |
| 4 | Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 4 | 2 | | тэст, канспект |
| 5 | Інфармацыйныя рэсурсы. Роля інфармацыі ў развіцці сучаснага грамадства | 4 | | 4 | тэст, абмеркаванні |
| | **Раздзел II. Тэорыя камунікацыі** | | | | |
| 6 | Генезіс і развіццё паняцця –камунікацыя” | 6 | 2 | 10 | тэст, красворд |
| 7 | Сучасныя падыходы да вывучэння камунікацый | 6 | 2 | 6 | тэст, эсэ |
| 8 | Камунікатыўная дзейнасць | 4 | 2 | 26 | тэст, абмеркванні |
| 9 | Віды, узроўні і формы сацыяльнай камунікацыі | 4 | | 18 | праблемныя заданні |
| 10 | Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць як сфера сацыяльных камунікацый | 4 | | 4 | даследчыя заданні |
| | **УСЯГО** | 44 | 12 | 78 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (ФІДК)

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Уводзіны** | | | | | | | |
| | Раздзел I. Тэорыя інфармацыі | | | | | | | |
| 1. | ***Тэма 1.*** Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 3.5 | | 4 | | 16 | | |
| 2. | ***Тэма 2.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі | 4 | | | | 4 | | |
| 3. | ***Тэма 3.*** Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 4 | | 2 | | | | |
| 4. | ***Тэма 4.*** Інфармацыйныя працэсы | 2 | | | | | | |
| 5. | ***Тэма 5.*** Інфармацыя як стратэгічны рэсурс грамадства | 4 | | | | | | |
| | Раздзел II. Тэорыя камунікацыі | | | | | | | |
| 6. | ***Тэма 6.*** Генезіс і развіццё паняцця ―камунікацыя” | 4 | | 4 | | 26 | | |
| 7. | ***Тэма 7.*** Канцэпцыі сацыяльных камунікацый | 2 | | | | 6 | | |
| 8. | ***Тэма 8.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі | 4 | | 2 | | 12 | | |
| 9. | ***Тэма 9.*** Камунікатыўная дзейнасць | 2 | | | | 4 | | |
| 10. | ***Тэма 10.*** Сацыяльная памяць | 2 | | | | 6 | | |
| 11. | ***Тэма 11.*** Камунікатыўныя каналы | 2 | | | | | | |
| 12. | ***Тэма 12.*** Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі | 2 | | | | 4 | | |
| | Усяго: | 36 | | 12 | | 78 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
**(135 “К” ГРУПА)**

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Уводзіны** | | | | | | | |
| | Раздзел I. Тэорыя інфармацыі | | | | | | | |
| 1. | ***Тэма 1.*** Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 3.5 | | 4 | | 16 | | |
| 2. | ***Тэма 2.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі | 6 | | | | 4 | | |
| 3. | ***Тэма 3.*** Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 4 | | | | | | |
| 4. | ***Тэма 4.*** Інфармацыйныя працэсы | 2 | | | | | | |
| 5. | ***Тэма 5.*** Інфармацыя як стратэгічны рэсурс грамадства | 4 | | | | | | |
| | Раздзел II. Тэорыя камунікацыі | | | | | | | |
| 6. | ***Тэма 6.*** Генезіс і развіццё паняцця ―камунікацыя” | 4 | | | | 26 | | |
| 7. | ***Тэма 7.*** Канцэпцыі сацыяльных камунікацый | 2 | | | | 6 | | |
| 8. | ***Тэма 8.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі | 6 | | 4 | | 12 | | |
| 9. | ***Тэма 9.*** Камунікатыўная дзейнасць | 2 | | | | 4 | | |
| 10. | ***Тэма 10.*** Сацыяльная памяць | 2 | | | | 6 | | |
| 11. | ***Тэма 11.*** Камунікатыўныя каналы | 2 | | | | | | |
| 12. | ***Тэма 12.*** Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі | 2 | | | | 4 | | |
| | Усяго: | 40 | | 8 | | 78 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
**ФЗН (4 ГАДЫ НАВУЧАННЯ)**

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Уводзіны** | | | | | | | |
| | Раздзел I. Тэорыя інфармацыі | | | | | | | |
| 1. | ***Тэма 1.*** Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 1,5 | | | | | | |
| 2. | ***Тэма 2.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі | 2 | | | | | | |
| 3. | ***Тэма 3.*** Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 2 | | | | | | |
| 4. | ***Тэма 4.*** Інфармацыйныя працэсы | | | | | | | |
| 5. | ***Тэма 5.*** Інфармацыя як стратэгічны рэсурс грамадства | 2 | | | | | | |
| | Раздзел II. Тэорыя камунікацыі | | | | | | | |
| 6. | ***Тэма 6.*** Генезіс і развіццё паняцця ―камунікацыя” | 1,5 | | | | | | |
| 7. | ***Тэма 7.*** Канцэпцыі сацыяльных камунікацый | 2 | | | | | | |
| 8. | ***Тэма 8.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі | 2 | | 2 | | | | |
| 9. | ***Тэма 9.*** Камунікатыўная дзейнасць | | | | | | | |
| 10. | ***Тэма 10.*** Сацыяльная памяць | 2 | | | | | | |
| 11. | ***Тэма 11.*** Камунікатыўныя каналы | | | | | | | |
| 12. | ***Тэма 12.*** Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі | | | | | | | |
| | Усяго: | 14 | | 2 | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**ФЗН (5 ГАДОЎ НАВУЧАННЯ)**

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Уводзіны** | | | | | | | |
| | Раздзел І. Тэорыя інфармацыі | | | | | | | |
| 1. | ***Тэма 1.*** Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 1,5 | | 2 | | | | |
| 2. | ***Тэма 2.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі | 2 | | | | | | |
| 3. | ***Тэма 3.*** Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | | | | | | | |
| 4. | ***Тэма 4.*** Інфармацыйныя працэсы | | | | | | | |
| 5. | ***Тэма 5.*** Інфармацыя як стратэгічны рэсурс грамадства | 2 | | | | | | |
| | Раздзел ІІ. Тэорыя камунікацыі | | | | | | | |
| 6. | ***Тэма 6.*** Генезіс і развіццё паняцця ―камунікацыя” | 2 | | | | | | |
| 7. | ***Тэма 7.*** Канцэпцыі сацыяльных камунікацый | | | | | | | |
| 8. | ***Тэма 8.*** Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі | 2 | | 2 | | | | |
| 9. | ***Тэма 9.*** Камунікатыўная дзейнасць | | | | | | | |
| 10. | ***Тэма 10.*** Сацыяльная памяць | | | | | | | |
| 11. | ***Тэма 11.*** Камунікатыўныя каналы | | | | | | | |
| 12. | ***Тэма 12.*** Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі | | | | | | | |
| | Усяго: | 10 | | 4 | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

| № п/п | Тэма семінара | Колькасць ауд. гадзін |
|---|---|---|
| 1 | Інфармацыя як навуковая катэгорыя | 4 |
| 2 | Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення | 2 |
| 3 | Генезіс і развіццё паняцця ―камунікацыя” | 4 |
| 4 | Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі | 2 |
| | **Усяго** | 12 |

## СЕМІНАР № 1

па тэме **“Інфармацыя як навуковая катэгорыя”**, 4 гадзіны

### Пытанні

1. Ахарактарызуйце асноўныя этапы развіцця паняцця ―інфармацыя”. Вызначце, як абагачаўся змест паняцця інфармацыі на кожным з этапаў.
2. Патлумачце сутнасць атрыбутыўнага, функцыяналістычнага, камунікатыўнага падыходаў да разумення феномена інфармацыі. Вызначце падыходы, якімі карыстаюцца аўтары падручнікаў ―Інфарматыка” (1) і ―Інфарматыка як навука аб інфармацыі"(2), абгрунтуйце адказ*.
3. Раскрыйце сутнасць разумення інфармацыі як адлюстраванай разнастайнасці. Якія аргументы прыводзяцца ў якасці крытыкі дадзенага падыхода ў тэорыі інфармацыі?* Якія формы адлюстравання інфармацыі існуюць у жывой і нежывой прыродзе?
4. Вызначце, як суадносяцца паняцці ―інфармацыя”, ―дадзеныя”, ―звесткі”, ―веды”.
5. Як вызначаецца паняцце інфармацыі ў матэматыцы, кібернетыцы, прыродазнаўчых навуках, сацыялогіі? Прачытайце артыкул Е.А. Мядзведзевай "Сучасная трактоўка паняцця інфармацыя" і вызначыце, як разумеецца інфармацыя ў інфарматыцы, журналістыцы, бібліяграфазнаўстве, архівазнаўстве.
6. Прачытайце артыкул Р.С. Матульскага "Механізм фарміравання і распаўсюджвання інфармацыі" і вызначце, як разумеецца аўтарам генетычная інфармацыя, ноаінфармацыя, сінхронны дакумент, дыяхронны дакумент.

* - заданне павышанай складанасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ЛІТАРАТУРА*

1. Акулов, О.А., Медведев, Н.В. Информатика: базовый курс; учебник для студентов вузов, бакалавров, магистров / О.А. Акулов, Н.В. Медведев. – Москва : Омега–л, 2004. – С. 4–8.
2. Информатика как наука об информации: информационный, документальный, технологический, экономический, социальный и организационный аспекты / Р.С. Гиляревский, И.И. Родионов, Г.З. Залаев и др.; под ред. Р.С. Гиляревского; автор-составитель В.А. Цветкова. – Москва: Фан – пресс, 2006. – С. 7–19.
3. Медведева, Е.А. Современная трактовка понятия информация / Е.А. Медведева // НТБ. – 1998. – № 8. – С. 10–23.
4. Мотульский, Р.С. Механизм формирования и распостранения нооинформации / Р.С. Мотульский // НТБ. – 2000. – № 10. – С. 4–15.

## СЕМІНАР № 2

па тэме **“Сацыяльная інфармацыя і формы яе прадстаўлення”,**

2 гадзіны

**Пытанні**

1. Патлумачце паняцце “сацыяльная інфармацыя”. Якія віды сацыяльнай інфармацыі вызначаюць навукоўцы?
2. Якія функцыі выконвае сацыяльная інфармацыя? У чым праяўляецца іх узаемасувязь? Раскрыйце сутнасць кіраўнічай функцыі сацыяльнай інфармацыі. Як праяўляецца сувязь інфармацыі і кіравання ў а) біялагічных і б) сацыяльных сістэмах?*
3. Назавіце формы існавання сацыяльнай інфармацыі. Ахарактарызуйце механізм арэчаўлення сацыяльнай інфармацыі ў дакуменце. У чым спецыфіка дакументаванай формы арэчаўлення інфармацыі?*
4. У чым сутнасць сінтаксічнага, семантычнага, прагматычнага ўзроўняў сацыяльнай інфармацыі? Якія падыходы да вымярэння інфармацыі вызначаюцца на кожным з гэтых узроўняў?
5. Раскрыйце паняцце “інфармацыйны рэсурс”. Як суадносяцца паняцці “інфармацыйны рэсурс”, “сацыяльная інфармацыя”, “дакументны рэсурс”. Ахарактарызуйце агульныя і спецыфічныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў у параўнанні з матэрыяльнымі і энергетычнымі.
6. Назавіце функцыі і прынцыпы інфармацыйных рэсурсаў. Прывядзіце прыклады праяўлення дадзеных функцый і прынцыпаў у бібліятэчна-бібліяграфічнай сферы. Якія інфармацыйныя працэсы ажыццяўляюцца ў бібліятэках?*

* - заданні павышанай складанасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ЛІТАРАТУРА*

1. Лявончыкаў, В.Е. Тэарэтычныя праблемы інфармацыйных рэсурсаў / В.Е. Лявончыкаў // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 95 – 100.
2. Манойло А.В. Информация, ее роль и функции в социальных системах : / А.В. Манойло // Государственная информационная политика в особых условиях. – Москва : МИФИ, 2003. – 388 с. (электронный вариант http://www.evartist.narod.ru/text24/0025.htm).
3. Теория информации. Представление об информационном ресурсе // Планета информатики. – Режим доступа: http://www.inf1.info/informationresource.
4. Теория информации. Свойства социальной информации // Планета информатики. – Режим доступа: http://www.inf1.info/propertyinformation.
5. Информационные ресурсы, теория информации, информатика // Воройский, Ф.С. Информатика. Новый систематизированный толковый словарь. – Москва, 2003. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/book/1/Doc4.HTML.
6. Что такое искусственный интеллект // Эндрю, А. Искусственный интеллект. – Москва: Мир, 1985. – С. 17–41. (электронный вариант http://reslib.com/#!/book/Iskusstvennij_intellekt__Endryu_A__/63396/read/267).

## СЕМІНАР № 3

па тэме **“Генезіс і развіццё паняцця “камунікацыя”,** 4 гадзіны

### Пытанні

1. Калі пачалося вывучэнне камунікацыі? Вызначце і ахарактарызуйце асноўныя дасягненні тэорыі камунікацыі на наступных этапах яе развіцця: а) антычнасць; б) сярэднявечча; в) канец 18–19 ст.; г) пачатак 20 ст.; д) 1950–2000 гг.; е) пачатак 21 ст. Прыдумайце назву для кожнага з гэтах этапаў*.
2. Як вывучалася праблема камунікацыі ў семіётыцы, герменэўтыцы, біхевіярызму, экзістэнцыялізму, персаналізму, лінгвістычнай філасофіі, сімвалічным інтэракцыянізму?
3. Патлумачце сутнасць трансляцыйнай і інтэракцыянальнай парадыгмы разумення феномену камунікацыі. Як вывучалася праблема камунікацыі ў трансляцыйных і інтэракцыйных тэорыях 20 стагоддзя? Чаму культуралагічная тэорыя камунікацыі Маклюэна адносіцца да трансляцыйных тэорый?* Чаму тэорыя сацыяльнага абмену лічыцца інтэракцыйнай?*
4. Як вывучаецца феномен камунікацыі ў сучасных рытарычным, семіятычным, кібэрнэтычным, сацыяпсіхалагічным, культуралагічным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

герменэўтычным падыходах? У чым сутнасць сучаснага экзістэнцыяльнага падыходу да вывучэння камунікацыі? Ахарактарызуйце канцэпцыю думкакамунікацыі.

5. Раскрыйце сутнасць постнекласічнага разумення феномена камунікацыі. У чым розніца паміж класічным, некласічным і постнекласічным уяўленнем аб працэсе камунікацыі? Што Фуко называў ―сціплым чытаннем”? Патлумачце постмадэрнісцкія паняцці дыскурса, азначвання, наратыву, трансгрэсіі. Як змяняецца разуменне сутнасці камунікацыі ў кантэксе ўстаноўкі ―смерць суб'екта”, ―смерць аўтара”?*

* - заданні павышанай складанасці

*ЛІТАРАТУРА*


1. Кашкин, В.Б. Введение в теорию коммуникации / В.Б. Кашкин. – Воронеж: изд. ВГТУ, 2000 (электронный вариант http://kachkine.narod.ru/CommTheory/Contents/Contents.htm).
2. Соколов, А.В. Общая теория социальной коммуникации: учеб. пособие / А.В. Соколов. – СПб, 2002. – 461 с. (электронный вариант http://www.socioline.ru/node/842).
3. Володина, Л.В. Деловое общение и основы теории коммуникации / Л.В. Володина, О.К. Карпухина. – СПб., 2002 (электронный вариант http://dvo.sut.ru/libr/sotciolo/volod/n2.htm).
4. Гнатюк, О.Л. Основы теории коммуникации : учеб. пособие / О.Л. Гнатюк. – СПб.: Кнорус, 2008. – 256 с.
5. Моисеева, А.П. Основы теории коммуникации : учеб. пособие / А.П. Моисеева. – Томск, 2004. (электронный вариант http://ctl.tpu.ru/files/teorcommup.pdf).
6. Почепцов, Г. Теория коммуникации : учеб. пособие / Г. Почепцов. – М., 2001. – 656 с. (электронный вариант http://yanko.lib.ru/books/betweenall/pochepcov-theory-of-com.htm).


## СЕМІНАР № 4

па тэме **"Метадалагічныя пытанні тэорыі камунікацыі",** 2 гадзіны

**Пытанні**

1. Вызначце, як суадносяцца паняцці ―камунікацыя”, ―зносіны”, ―дыялог”, ―сацыяльная камунікацыя”, ―дыскурс”
2. Прывядзіце прыклад азначэнняў паняцця камунікацыі і мадэляў камунікацыі, якія распрацаваны ў межах трансляцыйнай парадыгмы. Абгрунтуйце адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. У чым сутнасць нелінейных мадэляў камунікацыі? У межах якой парадыгмы разумення паняцця камунікацыі яны распрацаваны? Прывядзіце іх прыклады, аргументуйце адказ*.
4. Якія формы камунікатыўнай дзейнасці вызначаюць навукоўцы? Якая з гэтых формаў, на вашу думку, узнікла раней? Якая форма камунікатыўнай дзейнасці – дыялог ці кіраванне - патрабуе больш высокага узроўню падрыхтоўкі ад суб’ектаў камунікацыі? Абгрунтуйце адказ.
5. Як падраздзяляюцца камунікацыі на падставе колькасці і складу ўдзельнікаў камунікацыі? Патлумачце паняцце інтраперсанальнай камунікацыі. Як размяжоўваецца групавая і масавая камунікацыя? Калі пры размове двух асоб прысутнічаюць сведкі, то да якога віду адносіцца дадзеная камунікацыя? Што такое “абагульнены камунікант”? Прывядзіце прыклады.
6. Дайце вызначэнне каналу сацыяльных камунікацый. Якія каналы камунікацый вызначаюць навукоўцы? У чым спецыфіка бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці як каналу сацыяльнай камунікацыі?

* - заданні павышанай складанасці

*ЛІТАРАТУРА*


1. Кашкин, В.Б. Введение в теорию коммуникации / В.Б. Кашкин. – Воронеж: изд. ВГТУ, 2000 (электронный вариант http://kachkine.narod.ru/CommTheory/Contents/Contents.htm).
2. Соколов, А.В. Общая теория социальной коммуникации: учеб. пособие / А.В. Соколов. – СПб, 2002. – 461 с. (электронный вариант http://www.socioline.ru/node/842).
3. Володина, Л.В. Деловое общение и основы теории коммуникации / Л.В. Володина, О.К. Карпухина. – СПб., 2002 (электронный вариант http://dvo.sut.ru/libr/sotciolo/volod/n2.htm).
4. Гнатюк, О.Л. Основы теории коммуникации : учеб. пособие / О.Л. Гнатюк. – СПб.: Кнорус, 2008. – 256 с.
5. Моисеева, А.П. Основы теории коммуникации : учеб. пособие / А.П. Моисеева. – Томск, 2004. (электронный вариант http://ctl.tpu.ru/files/teorcommup.pdf).
6. Почепцов, Г. Теория коммуникации : учеб. пособие / Г. Почепцов. – М., 2001. – 656 с. (электронный вариант http://yanko.lib.ru/books/betweenall/pochepcov-theory-of-com.htm).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫКА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Тэма самастойнай работы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1 | Сучасныя падыходы да вызначэння сутнасці феномена інфармацыі | 6 |
| 2 | Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях | 4 |
| 3 | Лінейныя і нелінейныя мадэлі камунікацыі | 6 |
| 4 | Тыпы і віды камунікатыўнай дзейнасці | 4 |
| 5 | Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі | 4 |
| 6 | Сацыяльная памяць | 6 |
| 7 | Законы і заканамернасці камунікацыі | 6 |
| 8 | Эвалюцыя сацыяльных камунікацый | 6 |
| 9 | Сацыяльная камунікацыя: паняцце, сутнасць, разнавіднасці | 26 |
| 10 | Тэорыя інфармацыі і камунікацыі: тэрмінасістэма дысцыпліны | 10 |
| | **Усяго** | **78** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1. Сучасныя падыходы да вызначэння сутнасці феномена інфармацыі, 6 гадзін

**Заданне для СРС** – прааналізаваць азначэнні паняцця інфармацыі па даведачных крыніцах, вызначыць, да якой канцэпцыі (атрыбутыўнай, функцыяналістычнай, камунікатыўнай) адносіцца кожнае азначэнне, абгрунтаваць, вынікі размясціць у табліцы:

| азначэнне паняцця ―інфармацыя” | крыніца | канцэпцыя | абгрунтаванне |
|---|---|---|---|
| Одна из трех фундаментальных субстанций (вещество, энергия, информация) составляющих сущность мироздания и охватывающих любой продукт мыслительной деятельности, прежде всего – знания, образы | Современный экономический словарь, 2003 | атрыбутыўная | інфармацыя як неад’емны атрыбут усіх сістэм аб’ектыўнай рэальнасці |
| - | - | - | - |
| - | - | - | - |
| - | - | - | - |

* – заданне павышанай складанасці

Для выканання задання неабходна выкарыстаць не менш чым 10 даведачных выданняў (даведнікаў, слоўнікаў, энцыклапедый), якія адносяцца да розных галін ведаў: матэматыцы, эканоміцы, філасофіі, логіцы, палітыцы, сацыялагіі, прыродадзнаўства, інфармацыйных навук і інш. Магчыма выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў Інтэрнэт (напрыклад, Яндэкс. Слоўнікі), пры гэтым у графе ―крыніца” ўказваецца назва крыніцы і электронны адрас старонкі, на якой размешчана азначэнне.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў; 2. Субяседаванне па тэме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2. Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях, 4 гадзіны

**Заданне для СРС** – вызначыць, пры дапамозе якога падыходу да вымярэння інфармацыі (тэхнічны, энтрапійны, верагоднасны, тэзаурусны, бібліяметрычны, прагматычны) мэтазгодна вымяраць інфармацыю ў наступных выпадках:

1. Вымярэнне колькасці інфармацыі, якая патрабуецца для вызначэння, які вобраз часцей сустракаецца ў беларускіх фальклорных творах – вобраз ваўка ці мядзведзя
2. Вызначэнне самай папулярнай літары беларускага алфавіту
3. Вызначэнне аптымальнай формы перадачы пазнавальнай інфармацыі для дзяцей – мультыплікацыйная ці адаптаваная пазнавальная праграма
4. Вызначэнне, каму з вядомых пісьменнікаў належыць пэўная цытата
5. Выяўленне горада з самымі шчаслівымі жыхарамі па выніках апытання з адказам на пытанне «Вы адчуваеце сябе шчаслівым ТАК/НЕ»
6. Вылічэнне аптымальнай для чытальнасці колькасці слоў на баннеры на хуткаснай магістралі

Для выканання задання неабходна выкарыстоўваць матэрыялы лекцыі па тэме: ―Метадалагічныя пытанні тэорыі інфармацыі": Класіфікацыя мер інфармацыі. Вымярэнне інфармацыі на сінтаксічным, семантычным, прагматычным узроўнях. Вынікі работы занесці ў табліцу.

| № задання | падыход да вымярэння інфармацыі | мера вымярэння інфармацыі | абгрунтаванне падыходу |
|---|---|---|---|
| 1 | энтрапійны | сінтаксічная | ступень змяншэння нявызначанасці пры роўнаверагоднай з'яве |
| 2 | - | - | - |
| 3 | - | - | - |
| 4 | - | - | - |
| 5 | - | - | - |
| 6 | - | - | - |

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў.

2. Субяседаванне па тэме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 3. Лінейныя і нелінейныя мадэлі камунікацыі, 4 гадзіны**.

**Заданне для СРС** – самастойна вывучыць і законспектаваць тэму ―Лінейныя і нелінейныя мадэлі камунікацыі" па вучэбных дапаможніках. Звянуць асаблівую ўвагу на падыходы да разумення сутнасці камунікатыўных працэсаў (трансляцыйны або інтэракцыйны), якія закладзены ў аснову лінейных і нелінейных мадэляў. Канспект павінен змяшчаць не менш чым тры прыклады лінейных і нелінейных мадэляў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Кашкин, В.Б.* Введение в теорию коммуникации / В.Б. Кашкин. – Воронеж: изд. ВГТУ, 2000 (электронный вариант http://kachkine.narod.ru/CommTheory/Contents/Contents.htm).
2. *Володина, Л.В.* Деловое общение и основы теории коммуникации / Л.В. Володина, О.К. Карпухина. – СПб., 2002 (электронный вариант http://dvo.sut.ru/libr/sotciolo/volod/n2.htm).
3. *Почепцов, Г.* Теория коммуникации : учеб. пособие / Г. Почепцов. – М., 2001. – 656 с. (электронный вариант http://yanko.lib.ru/books/betweenall/pochepcov-theory-of-com.htm).
4. *Моисеева, А.П.* Основы теории коммуникации : учеб. пособие / А.П. Моисеева. – Томск, 2004. (электронный вариант http://ctl.tpu.ru/files/teorcommup.pdf).


**Форма кантролю СРС:** Праверка канспектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Тыпы і віды камунікатыўнай дзейнасці, 4 гадзіны

**Заданне для СРС** – правесці першасны аналіз прапанаваных камунікатыўных актаў па схеме:

| Крыніца (камунікант) | Форма паведамлення | Адрасат | Канал камунікацыі | Сфера камунікацыі | Від камунікацыі | Мэта камунікацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| індывід,<br>калегіяльны,<br>кaпeратыўны,<br>калегіяльна-кааператыўны,<br>калектыўны<br>масавы | пісьмовая<br>вусная<br>візуальная<br>змешаная | індывід,<br>калегіяльны,<br>капeратыўны,<br>калегіяльна-кааператыўны,<br>калектыўны<br>масавы | віды<br>вызначыць<br>самастойна | віды<br>вызначыць<br>самастойна | Міжасабовая<br>Групавая<br>Масавая | віды<br>вызначыць<br>самастойна |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

1. Выступленне з дакладам на навуковай канферэнцыі
2. Нарада ў бізнес-арганізацыі (прысутнічаюць кіраўнік і падначаленыя)
3. Прагляд прэм'еры фільма ў кіназалі
4. Афармленне супермаркета
5. Размяшчэнне тэксту у Жывым Журнале
6. Сустрэча Вялікай васьмёркі

Для выканання работы неабходна вывучыць тэмы ―Віды камунікатыўнай дзейнасці", ―Формы камунікатыўнай дзейнасці", ―Сацыяльныя сферы камунікацыі", ―Камунікацыйныя каналы" па канспектах лекцый, а таксама па вучэбных дапаможніках.

*ЛІТАРАТУРА*


1 *Кашкин, В.Б.* Введение в теорию коммуникации / В.Б. Кашкин. – Воронеж: изд. ВГТУ, 2000 (электронный вариант http://kachkine.narod.ru/CommTheory/Contents/Contents.htm).

2 *Соколов, А.В.* Общая теория социальной коммуникации: учеб. пособие / А.В.Соколов. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2002. – 461 с. (электронный вариант http://www.socioline.ru/node/842).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў.

2. Субяседаванне па тэме.

## Тэма 5. Інфармацыйная і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць як каналы сацыяльнай камунікацыі, 2 гадзіны

**Заданне для СРС** – карыстаючыся канспектам і прапанаванымі вучэбнымі дапаможнікамі, вызначыць, да якіх формаў камунікацыі (міжасабовая, групавая, масавая) адносяцца наступныя віды бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці:

1. Запіс чытача ў бібліятэку
2. Арганізацыя кніжнай выставы
